# Рашучае папярэджаньне

## Тэлеграма

### ЦК КП(б)Б і СНК БССР адстаючым раёнам па сяўбе

Вынікі пяціднёўкі на 31 мая з ўсёй відавочнасьцю паказваюць, што рад раёнаў БССР: Віцебскі, Магілёўскі, Аршанскі, Вузьдзенскі Веткаўскі і. г. д. разьлічваюць цягнуць са сканчэньнем сяўбы да чэрвеня месяца. Разам з гэтым рад раёнаў паказаў, што пры ўсіх неспрыяючых умовах, на якія менавіта спасылаюцца опортуністычныя элемэнты (надвор'е і. г. д.) можна было скончыць сяўбу да чэрвеня. Асабліва паказальным ў гэтых адносінах зьяўляецца барацьба за сяўбу Маскоўскай арганізацыі, поўнасьцю скончыўшай сяўбу на 31 мая і штодзённа перавыконваючы пляны сяўбы, а таксама Ленінградскай, Іванава-Вазьнесенскай арганізацый, паказваючы бальшавіцкія тэмпы барацьбы за сяўбу.

Ганебнае адставаньне ў ходзе сяўбы раду раёнаў БССР сьведчыць, што у гэтых арганізацыях у асаблівасьці партыйным савецкім кіраўніцтве ў наяўнасьці опортуністычныя ўстаноўкі замест бальшавіцкай барацьбы за сяўбу.

ЦК і СНК папярэджваюць, што канчатковым тэрмінам барацьбы за сяўбу для гэтых адстаючых раёнаў зьяўляецца апошняя пяціднёўка. Астатнія раёны, падыходзячыя к канцу барацьбы за сяўбу, павінны скончыць яе не пазьней бліжэйшых двух дзён. Гэта тым больш можна выканаць, што мы маем ужо сёньня рад раёнаў, даўшых апошнюю пяціднёўку ад 20—30 процантаў прыросту (Шклоў, Старыя Дарогі, Чырвонапольле).

Прэзідэнцкая бібліятэка
Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы